ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



ЛЮТЫ – САКАВІК

Віцебск 2014

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Люты–сакавік**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК

2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : люты–сакавік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Люты–сакавік**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Адказны за выпуск А.І. Сёмкін
Камп'ютарная вёрстка А.В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

## ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………………4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**
Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне…………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 лютага па 31 сакавіка 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Пастаўскай, Полацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

У **сакавіку** ў Нацыянальным тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм’ера мюзікла-памфлета “Дыліжанс”. Спектакль паставіў рэжысёр *Юрый Кулікоўскі*, музыку напісаў кампазітар *Уладзімір Кандрусевіч*, у галоўнай ролі актрысы *Наталля Аладка* і *Юлія Цвікі*.

*Витебские вести. – 2013. – 13 марта. – С. 23.*

**27 сакавіка**, у Мінску , на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, адбылася цырымонія ўручэння тэатральнай прэміі Беларусі. “Крыштальнай Паўлінкай” узнагароджаны народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Тадэвуш Кокштыс*. Артыстцы *Наталлі Аладка* ўручаны ганаровы знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”. Артыстка *Ірына Цішкевіч* ўзнагароджана Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Артысты Беларускага тэатра “Лялька” таксама атрымалі ўзнагароды. Артыст вядучы майстар сцэны *Ларыса Мартынава* была адзначана Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, артыст вышэйшай катэгорыі *Яўген Гусеў* атрымаў Грамату Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а мастак *Сяргей Аўчыннікаў* – Удзячнасць Міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

*http://kolastheatre.by/ru/news/v-den-teatra-tri-nagrady-tadeush-kokshtys-natalya-aladko-irina-tishkevich*

Новы спектакль у тэатры “Лялька” **ў сакавіку** паставіла беларуская спявачка і паэтка *Святлана Бень*. Музычны спектакль “Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам” створаны па матывах шведскіх казак.

*Витебские вести. – 2013. – 18 марта. – С. 5.*

гісторыка-краязнаўчым музеі г. Сянно.

*Витебские вести. – 2013. – 15 марта. – С. 16.*

У Культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо Віцебска «Дзвіна»” ў **сакавіку** працавала расійска-беларуская выстаўка “Незнакомка. Капель”. Гэта працяг супрацоўніцтва Міжнароднай творчай асацыяцыі фітакалажыстаў “Флориссима” (Расійская Федэрацыя, г.Масква) і Народнага клуба аматараў фларыстыкі “Анюта” (г. Віцебск).

*Витебские вести. – 2013. – 20 марта. – С. 21.*

**25 сакавіка** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрылася выстаўка народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Шумілінскага Дома рамёстваў для прагляду членамі экспертнай камісіі і наведвальнікамі на прадмет пацвярджэння наймення “народны самадзейны калектыў”.

*Віцебскі АМЦНТ*

*МУЗЫКА*

**14 лютага** ў абласной філармоніі адбыўся канцэрт “Есть ли любовь, скажи..”, у які ўвайшлі кавер-версіі расійскіх і замежных хітоў у выкананні гітарыста Г. Емяльянава і вакалісткі А. Бізунковай.

*Витебские вести. – 2013. – 6 февр. – С. 24.*

**13 сакавіка** ў канцэртнай зале Сафійскага сабора адбылося адкрыццё **XXVII Міжнароднага фестывалю старажытнай і сучаснай камернай музыкі.** Вядомыя майстры выканальніцкага мастацтва з Расіі, Іспаніі, Польшчы, Германіі, Украіны і Беларусі стануць удзельнікамі фестывальных канцэртаў, якія будуць доўжыцца да 2 мая.

*http://sophia.polotsk.museum.by/node/35188*
*http://www.vitebsk-region.gov.by/ru/news/v-vitebskoj-oblastnoj-filarmonii-projdet-kontsert-kamernoj-*

У **сакавіку** ў Віцебскім дзяржаўным музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага пасля капітальнага рамонту адкрылася канцэртная зала.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 25 марта. – С. 2.*





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

**14 лютага** ў КЗ «Віцебск» адбылося ўшаноўванне лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» за 2013 год.

Рашэннем абласнога выканаўчага камітэта № 73 ад 05.02.2014 г. ганаровае званне “Чалавек года Віцебшчыны” ў намінацыі “Культура, мастацтва, духоўнае адраджэнне” прысвоена:

– *Багараду Леаніду Абрамавічу* – намесніку генеральнага дырэктара па канцэртнай дзейнасці дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры “Віцебск”»;

– *Каравіно Людміле Пятроўне* – дырэктару дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Дзіцячая школа мастацтва № 3”, г. Барань, Аршанскі раёна.

*Витебские вести. – 2013. – 13 февр. – С. 13.*

Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама узнагароджана “Залатым фаліянтам” і дыпломам Першай ступені ў Нацыянальным конкурсе “Мастацтва кнігі-2014” у тэматычнай намінацыі “АРТ-кніга” за падрыхтоўку навукова-папулярнага выдання “Мастацтва INSITA. З гісторыі правядзення выставак непрафесійнага мастацтва”. Кніга падрыхтавана вядучым метадыстам ДУ “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” Л.У. Вакар і калектывам аўтараў.

У **лютым** у г. Оршы адбылася выніковая калегія, на якой былі падведзены вынікі работы ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама, аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гаррайвыканкамаў, адміністрацый раёнаў г. Віцебска, сродкаў масавай інфармацыі, тыпаграфій, установ культуры вобласці ў

2013 годзе, асноўных накірунках і змесце іх дзейнасці на 2014 год.

Рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта № 139 ад 5 сакавіка 2014 г. Аб прысуджэнні прэміі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта "Літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі". На падставе пункта № 10 Інструкцыі аб парадку прысуджэння прэміі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта "Літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі", зацверджанай рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 18 красавіка 2012г. " 240, Віцебскі абласны выканаўчы камітэт рашыў:

1. Прысудзіць прэмію Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта "Літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі" за 2013 год наступным лаўрэатам:

у намінацыі "проза (у тым ліку публіцыстыка і драматургія)" – *Валодзьку Алегу Адольфавічу* за кнігу "Сын земли и неба";

у намінацыі "паэзія" – *Русілцы Вользе Іванаўне* за кнігу "Сцежка, сцежачка, сцяжынка";

у намінацыі "літаратура для дзяцей" – *Жыгунову Аляксандру Міхайлавічу* за кнігу "Баравічок на скутары".

*Витебские вести. – 2013. – 11 марта. – С. 7.*

Напярэдадні Дня жанчын ў КЗ "Віцебск" традыцыйна ўшаноўвалі шматдзетных маці. Святочны канцэрт быў падрыхтаваны Цэтрам культуры "Віцебск", у ім прынялі ўдзел заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбля танца "Егоза", ансамбля класічнага танца "Піруэт", узорнай цыркавой студыі "Арэна", шоу-балета "Сенсацыя", заслужанага аматарскага калектыва Рэспублікі Беларусь харэаграфічнага ансамбля "Зорька" і інш.

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

Выхаванцы Віцебскай дзіцячай школы мастацтваў імя А.В. Багатырова *Ева* і *Ніколь Рагатнікавы* і *Віктар Стэфаненка* сталі пераможцамі XXI Міжнароднага конкурсу юных піяністаў "Амадеус-2014", якія адбыўся 13–15 лютага ў г. Брно (Чэхія). Ніколь Рагатнікава



*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

**7 лютага** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці прайшлі заняткі ў творчай лабараторыі "Школа рэжысёраў" і абласны семінар для спецыялістаў раённых і гарадскіх устаноў культуры па падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў сумесна з Цэнтрам нацыянальнай культуры г. Рыгі (Латвія), па абмену вопытам правядзення масавых культурных мерапрыемстваў у Латвіі і прэзентацыя значных культурных падзей Віцебшчыны, такіх, як Міжнародны фестываль песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны "Дняпроўскія галасы ў Дуброўна" і Міжнароднае свята традыцыйнай культуры "Браслаўскія зарніцы".

*Віцебскі АМЦНТ*

З **12 лютага** па **3 сакавіка** ў Культурна-гістарычным комплексе "Залатое кальцо Віцебска «Дзвіна»" прайшла выстаўка "Параллельные миры", на якой былі прадстаўлены работы ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання "Беларуская саломка" Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна горада Віцебска.

З **19 лютага** па **11 сакавіка** ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ працавала абласная выстаўка-конкурс па вязанні "Карункі зімы". раённага Цэнтра рамёстваў "Адраджэнне" ("Традыцыйнае арнаментальнае вязанне"); *Я. Дзям'яненка* з Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору ("За калекцыю традыцыйных вырабаў"); *Н. Кукуць*, *Н. Чымірыкіна* з Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка ("Традыцыйнае вязанне"); *В. Кавалёнак* з Шумілінскага Дома рамёстваў ("За захаванне народных традыцый" і "За высокае майстэрства выканання"); *Т. Мятлюк* з Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка ("За адраджэнне тэхнікі вязання касцяной іголкай") і інш.

*Віцебскі АМЦНТ*

Персанальная выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці загадчыцы Обальскага клуба-бібліятэкі *Веры Берашэвіч* экспанавалася ў

“Прывітанне з лепельскага краю” мастакоў *Аляксандра* і *Ігара Саўчанкаў*, *Івана* і *Дзмітрыя Будзічаў*.

*Витебские вести. – 2013. – 4 февр. – С. 8.*

У віцебскім Мастацкім музеі ў **лютым** працавала выстаўка работ, створаных у час пленэраў імя Я. Драздовіча “Прастора традыцыі”. У экспазіцыі было прадстаўлена больш за 500 работ 19 аўтараў (пейзажы, партрэты, тэматычныя кампазіцыі і інш.).

*Витебские вести. – 2013. – 8 февр. – С. 13.*

“Видимое несказанное” – пад такой назвай у абласным краязнаўчым музеі ў **лютым** праходзіла выстаўка работ педагогаў кафедры фатаграфіі Мастацкага ўніверсітэта (г. Познань, Польшча).

*Витебские вести. – 2013. – 20 февр. – С. 23.*

З **14 лютага** па **7 сакавіка** ў Мастацкім музеі Віцебска экспанавалася выстаўка работ народнага мастака Беларусі *Паўла Васільевіча Масленікава*, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння майстра Тут былі прадстаўлены 47 твораў мастака з Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, з фонда Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава і з калекцыі сям’і мастака.

*http://www.vitebsk-region.gov.by/ru/news/vystavka-narodnyj-xudozhnik-belarusi-pavel-maslenikov-proxodit-v-vil*

У залах Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыкі ў **лютым** адкрылася V Міжнародная выстаўка “Коллегиум” (жывапіс, графіка, артаб’екты, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Яе арганізатары – музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны, Беларускі саюз мастакоў, Пасольства Індыі ў Рэспубліцы Беларусь, Смаленская і Кемераўская арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі, Аршанскі гарадскі цэнтр культуры.

*Витебские вести. – 2013. – 4 марта. – С. 8.*



заваявала першае месца і спецыяльны прыз журы “За лучшее выступление конкурса” і адзіная ад Беларусі апынулася сярод удзельнікаў канцэрта лаўрэатаў. Віктар Стэфаненка стаў дыпламантам конкурсу і ўладальнікам спецыяльнага прыза ад фонда падтрымкі таленавітых муыкантаў.

*http://www.vitebsk-region.gov.by/ru/news/junye-pianisty-iz-vitebska-oderzhali-pobedu-na-prestizhnom-mezhdunarodnom-konkurse-v-chexii_i_10106.html*

Першае месца ў намінацыі “эстрадны вакал”, другія месцы ў намінацыях “мікс”, трэцяе ў катэгорыі “квартет” – такую колькасць дыпломаў прывезлі ўдзельнікі аршанскай арт-групы “Вдохновение” з Міжнароднага фестывалю-конкурсу “Привет, Италия!”, які адбыўся ў г. Рымані.

*Витебские вести. – 2013. – 8 февр. – С. 16.*

Мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра “Лялька” заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь *В. Клімчук* быў запрошаны ў якасці члена журы на XI Міжнародны Казачны тэатральны фестываль “Я – мал, привет!”. Фестываль прайшоў з **11** па **23 сакавіка** ў г. Новы Урангой (Расійская Федэрацыя).

*http://www.lialka.by/rus/news/#news-155*

З **24** па **29 сакавіка** ў сталіцы Эстоніі прайшоў VI Міжнародны конкурс-фестываль “Tallinn-Fest-2014”, удзел у якім прынялі навучэнцы полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1 *Таіса Мацулевіч* і *Валерыя Хадасевіч*.

*Витебские вести. – 2013. – 29 марта. – С. 24.*

У г. Санкт-Пецярбургу на фасадзе дома № 7 на Перакупным завулку **28 сакавіка** была адкрыта мемарыяльная дошка ў выглядзе палітры жывапісца Марка Шагала, выкананая з мансураўскага граніту з уключэннем каляровай смальты. Аўтар мемарыяльнай дошкі архітэктар-мастак *Вячаслаў Бухаеў*.

*http://news.vitebsk.cc/2014/03/30/v-peterburge-otkryili-memorialnuyu-dosku-marku-shagalu/*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.
## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

**7 лютага** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці прайшлі заняткі ў творчай лабараторыі “Школа рэжысёраў” і абласны семінар для спецыялістаў раённых і гарадскіх устаноў культуры па падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў сумесна з Цэнтрам нацыянальнай культуры г. Рыгі (Латвія), па абмену вопытам правядзення масавых культурных мерапрыемстваў у Латвіі і прэзентацыя значных культурных падзей Віцебшчыны, такіх, як Міжнародны фестываль песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны “Дняпроўскія галасы ў Дуброўна” і Міжнароднае свята традыцыйнай культуры “Браслаўскія зарніцы”.

*Віцебскі АМЦНТ*

**19 лютага** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся вучэбна-метадычны трэнінг па пытаннях інфармацыйнай працы і інфарматызацыі ўстаноў культуры, ІБД і статыстыкі адміністратараў рэгіянальных баз даных.

*Віцебскі АМЦНТ*

**20 лютага** ў выставачнай зале “Духаўскі круглік” прайшла творчая сустрэча з гісторыкам-мастацтвазнаўцай *І. Абрамавай*. Тэма гутаркі – “Витебские губернаторы: чиновники имеценаты. Ракурс истории”.

*Витебские вести. – 2013. – 1 марта. – С. 16.*

**26–28 лютага** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культур прайшоў семінар для кіраўнікоў харавых калектываў на тэму “Стварэнне і арганізацыя работы аматарскага акадэмічнага харавога калектыву”.

*Віцебскі АМЦНТ*

**22 сакавіка** ўзорны ансамбль бальнага танца “Мозаика” Цэнтра



*Витебские вести. – 2013. – 22 февр. – С. 16.*

Выстаўка работ польскіх мастакоў *Ежы Таліка* і *Катажыны Гаўрых-Алендер* “Две стороны мира” (графіка) адкрылася ў **сакавіку** ў Арт-цэнтры Марка Шагала.

*Витебские вести. – 2013. – 20 марта. – С. 21 .*

У віцебскай ратушы ў **сакавіку** экспанавалася выстаўка габеленаў “Что у янтаря на уме?”, сатканых з янтарнай ніці, прысвечаная 20-годдзю аднаўлення дзейнасці Консульства Латвійскай Рэспублікі ў г. Віцебску.

*Витебские вести. – 2013. – 29 марта. – С. 3.*

Памятны знак землякам, якія выконвалі свой інтэрнацыянальны доўг у Афганістане адкрылі на Алеі славы каля СШ № 1 ў г. п. Бешанковічы **17 лютага**. Зараз ў вобласці няма ніводнага раёна, дзе не ўвекавечана памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў.

*http://www.vitebsk-region.gov.by/ru/news/pamjatnyj-znak-voinam-internatsionalistam-otkryli-v-*

## МАСТАЦТВА

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

У Мастацкім музеі абласнога цэнтра ў **лютым** экспанавалася выстаўка работ віцебскай мастачкі *Т. Беразоўскай* “Ожерелье для весны” (графіка).

*Витебские вести. – 2013. – 25 февр. – С. 8.*

Выстаўка мастачкі з Шаркаўшчынскага раёна, прадстаўніцы наіўнага мастацтва *Ванды Лагун* была прадстаўлена ў **лютым** у Мастацкім музеі г. Віцебска.

*Витебские вести. – 2013. – 6февр. – С. 24.*

У Культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо Віцебска «Дзвіна»” экспанавалася выстаўка жывапісу, графікі, разьбе па дрэве

жанчыны, што прысвяцілі сваё жыццё службе ў міліцыі (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

Вечар памяці "Афганскімі дарогамі" (*Дварэцкая сельская бібліятэка сумесна з ДК і аўтаклубам*).

**27 сакавіка** Семінар загадчыкаў і бібліятэкараў раёна на тэму "Сучасная бібліятэка ў сістэме патрыятычнага выхавання і фарміравання інфармацыйнай культуры" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк***

**2 лютага** Сустрэча з членам грамадзянскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны", захавальнікам экасістэмы балота "Ельня" *В.Ц. Кавалёнкам* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**22 лютага** Сустрэча "Суровая школа мужнасці" з воінам-інтэрнацыяналістам *В.С. Протасам* (*дзіцячая бібліятэка*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**7 лютага** Літаратурнае падарожжа "Лесные полянки с В. Бианки" для вучняў 3 "А" класа СШ № 1 (*дзіцячая бібліятэка*).

**23 лютага** Гульнёвая праграма "Весёлые герои любимых книг" па казках А. Пагарэльскага, П. Яршова, С. Аксакава (*Светласельская сельская бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

У Арт-цэнтры Марка Шагала ў **лютым** адкрылася выстаўка фатаграфій *Юозаса Будрайціса* "Моё кино. 1970–1990-е годы".

*Витебские вести. – 2013. – 11 февр. – С. 7.*

У Арт-цэнтры Марка Шагала прайшла прэзентацыя кнігі "Гавриил Юдин. Музыкальная жизнь Витебска в первой четверти XX века".



культуры "Віцебск" адзначыў сваё 30-годдзе.

*Витебские вести. – 2013. – 20 марта. – С. 23.*

**28 сакавіка** ў аграгарадку Райцы адбыўся семінар-практыкум па харэаграфіі для кіраўнікоў самадзейных харэаграфічных калектываў на тэму "Детская сюжетно-образная хореография в народно-сценическом и эстрадном танце" з паказальным заняткам "Дискотека у игрушек" дзіцячага самадзейнага харэаграфічнага калектыва "Маленькие непоседы" Райцаўскага СДК.

*РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

**13** і **20 лютага** ў г. п. Лёзна і г. Верхнядзвінску прайшоў **абласны конкурс патрыятычнай песні "Песні юнацтва нашых бацькоў"**, у час якога адбыўся адборачны тур Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў г. Маладзечна, па выніках якога ў фестывалі прымуць удзел індывідуальныя выканаўцы: *Максім Пісарэнка* (г. Віцебск), *Яна Павініч* (г. Віцебск), *Кіра Валынка* (г. Наваполацк). **11-12 сакавіка** ў Оршы адбыўся фінал юбілейнага (дваццатага) конкурсу, у якім прынялі ўдзел 15 індывідуальных выканаўцаў і 7 вакальных ансамбляў. У намінацыі "Вакальны ансамбль" перамог дуэт *Святланы Тофаравай* і *Ганны Пучкоўскай* (г. Наваполацк), а таксама вакальная група "Константа" (г. Віцебск), у намінацыі "Саліст-вакаліст" І месца прысуджана *Аляксандру Палячынскаму* (Чашніцкі раён), ІІ месца занялі *Максім Пісарэнка* (г. Віцебск) і *Кіра Валынка* (г. Наваполацк), ІІІ месца – *Валянціна Бабурова* (Талачынскі раён) і *Дар'я Васюковіч* (Бешанковіцкі раён). Спецыяльнамі прызамі і дыпломамі былі ўзнагароджаны *Вікторыя Паплеўчанкава* (Полацкі раён), *Яўген Шук* (Аршанскі раён), народны вакальны ансамбль "Панацэя" (г. Віцебск), *Крысціна Куляшова* (г. Віцебск), *Іван Галаўко* (Чашніцкі раён).

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2013. – 20 марта. – С. 21.*

**13–15 сакавіка** ў Віцебскай вобласці прайшоў **XII абласны агляд-конкурс клубаў "Ветэран" і ветэранскіх творчых калектываў "Не старэюць душой ветэраны"** ў межах Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў (заключныя мерапрыемствы адбудуцца ў ліпені бягучага года). Прысвечаны ён 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Арганізатарамі агляду-конкурсу выступілі Галоўнае ўпраўленнне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. Праграма прадугледжвала конкурсныя выступленні ветэранскіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў. Абавязковай умовай было выкананне твораў аб Вялікай Айчыннай вайне (або напісаных у гады вайны). Агляд праводзіўся па некалькіх зонах: у Віцебску, Оршы, г. п. Коханава Талачынскага раёна і г. п. Шаркаўшчына. У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел 57 калектываў мастацкай самадзейнасці з установаў культуры і іншых ведамстваў, а таксама больш за 60 індывідуальных выканаўцаў. Гран-пры конкурсу атрымалі два калектывы: народны вакальна ансамбль "Настальгія" культурна-дзелавога цэнтра "Першамайскі" (г. Віцебск) і хор ветэранаў "Залатыя гады" Докшыцкага гарадскога цэнтра культуры.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2013. – 20 марта. – С. 9.*

**21 сакавіка** ў г. п. Расоны прайшоў **X абласны агляд-конкурс фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі "Ад прашчураў да зор"**, прысвечаны памяці *Валянціны Літвінавай* – былога кіраўніка ўзорнага фальклорнага калектыву "Нежачкі" Расонскага цэнтра дзяцей і моладзі. Праграма абласнога агляду-конкурсу ўключала ў сябе выставу-конкурс вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, конкурсную праграму фальклорных калектываў, а таксама турнір выканаўцаў народных бытавых танцаў. На выстаўцы былі прадстаўлены калекцыі і асобныя вырабы: лялькі ў этнічных касцюмах, вышыўка, ткацтва, вырабы з прыродных матэрыялаў. Па выніках абласнога агляду-конкурсу фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі пераможцамі сталі:



**15 сакавіка** Віртуальная вандроўка "Абхазия – страна мечты" (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**16 сакавіка** Пасяджэнне краязнаўчага клуба "Я – Палачанін" на тэму "Туристические проекты Полоцка". Гасцямі мерапрыемства сталі навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка *Ігар Уладзіміравіч Загрэкаў* і спецыяліст Полацкага інфармацыйна-турыстычнага цэнтра *Наталля Анатольеўна Сініца* (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

Да Сусветнага дня паэзіі быў прымеркаваны літаратурны вечар па творчасці *Раісы Мікалаеўны Цітовай* (*Фарынаўская сельская бібліятэка*).

Скайп-канферэнцыя "И пусть всегда светит вам звезда счастья", прысвечаная прафесіі настаўніка замежных моў і прымеркаваная да Міжнароднага дня шчасця. У мерапрыемстве прынялі ўдзел студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ і навучэнцы Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 1, якія сустрэліся са студэнтамі з г. Баранавічы (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

### *Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана ў бібліятэках раёна прайшлі наступныя мерапрыемствы: вечар-рэквіем "Час выбраў іх" з удзелам старшыні Сенненскай раённай асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане (*цэнтральная раённая бібліятэка*), урок мужнасці "Памяць ўзросту не мае" (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка*), вечар-сустрэча "Час выбраў нас" (*Студзёнкаўская сельская бібліятэка*) і г. д.

**23 лютага** Тэатралізаванае прадстаўленне "Там, на неведомых дорожках" для вучняў 4-га класа (*дзіцячая бібліятэка*).

У **сакавіку** бібліятэкары сістэмы прынялі ўдзел у пасяджэнні пашыранага Савета аддзела ідэалагічнай рабты, культуры і па справах моладзі Сенненскага райвыканкама.

Свята "Только с этого дня начинается Весна", гасцямі якога сталі

Беларусь” (*цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Да Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі “А у книжек именины – целых семь веселых дней!” былі падрыхтаваны: пазнавальна-гульнёвая праграма “Книжкины истории”, экадыскатэка “Танец капельки с дождем” і інш. (*дзіцячая бібліятэка*).

### *Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк*

**5 лютага** Сустрэча старшакласнікаў СШ № 1 і 2 з паэтам і празаікам *М. Кукуцем*, прэзентацыя кнігі “На сёмым небе” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**14 сакавіка** Вечар-дыялог “Жывое слова мудрасці духоўнай” з протаіерэем *Віктарам Вабішчэвічам* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк*

**6 сакавіка** Экалагічная казка “Пра малпачку Чыту і яе сяброў” паводле казак А. Бадака (*дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі*).

**14 сакавіка** Урок-развага “Болезнь века – наркомания” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**29 сакавіка** Сустрэча з пісьменнікамі *І. Пракаповічам, В. Шышко, В. Лісіцкай, М. Кенькам, А. Легкастаевай*, мастаком-ілюстратарам *Н. Зямчонак* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

**11 сакавіка** Урок юрыдычнай асветы “Поступок. Проступок. Правонарушение” ў межах праграмы па прававым выхаванні моладзі “Закон обо мне, мне о законе” (бібліятэка імя Я. Купалы).

У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў бібліятэках раёна ў **сакавіку** адбыліся наступныя мерапрыемствы: тэатралізванае прадстаўленне “Вас ждут приключения на острове чтения” (*дзіцячая бібліятэка*), літаратурнае свята “Переполох в стране Книжулии” (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*) і інш.



– узорны фальклорны гурток “Нежачкі” ГУДА “Расонскі Цэнтр дзяцей і моладзі” – Гран-пры;

– узорны фальклорны калектыў “Знічка” ДУА “Палатоўскі дзіцячы сад-школа Полацкага раёна” – I месца;

– аматарскі ўзорны фальклорны калектыў “Кола” ДУА “Гімназія № 2 г. Наваполацка” – II месца;

– III месца не прысуджалася.

Таксама былі ўзнагароджаны калектывы і салісты ў намінацыі “сольныя спевы”: *Руслан Скрыпка* , саліст фальклорнага дзіцячага гуртка “Галасы вякоў” Сянькоўская СК Верхнядзвінскага раёна; *Аляксандр Савіцкі*, саліст узорнага фальклорнага гуртка “Нежачкі” ГУДО “Расонскі Цэнтр дзяцей і моладзі”. У намінацыі “народная музыка” ўзнагароджаны: узорны ансамбль народнай музыкі і песні “Званочкі” ДУА “Быхаўская дзіцячая школа мастацтваў” Пастаўскага раёна. У намінацыі “народныя гульні”: узорны фальклорны аматарскі калектыў “Лецейка” ДУА “Гомельская дзіцячая школа мастацтваў” Полацкага раёна. У намінацыі “абрады”: узорны фальклорны калектыў “Знічка” ДУА “Палатоўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа” Полацкага раёна.

**Пераможцы выстаўкі-конкурсу твораў ДПМ:**

I месца – Лепельскі Цэнтр рамёстваў;

II месца – узорны фальклорны аматарскі калектыў “Лецейка” ДУА “Гомельская дзіцячая школа мастацтваў” Полацкага раёна;

III месца – фальклорны дзіцячы гурток “Галасы вякоў” Сянькоўская СК Верхнядзвінскага раёна і гурток саломапляцення Чашніцкага Дома рамёстваў.

**Пераможцы конкурсу “Вырабы юных майстроў”**

I месца – Лепельскі Цэнтр рамёстваў і ўзорны фальклорны калектыў “Знічка” ДУА “Палатоўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа” Полацкага раёна;

III месца – Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору.

*Віцебскі АМЦНТ*

**Абласны этап II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю”** прайшоў **27 сакавіка** ў ДУА “Віцебскі каледж культуры і мастацтваў” і ЦК “Віцебск”. Конкурс спрыяе рэалізацыі мастацкага патэнцыялу таленавітай моладзі ў розных жанрах і відах мастацкай творчасці, накіраваны на фарміраванне эстэтычнага густу моладзі і ўдасканаленне прафесійнага майстэрства і выканальніцкай культуры яго ўдзельнікаў. Па выніках другога абласнога адборачнага тура журы вызначыла пераможцаў у 9 намінацыях:

**намінацыя “эстрадныя спевы”**

I месца – *Камянкоў Мікалай Антонавіч* (г. Наваполацк), Лейкіна Анастасія Паўлаўна (г. Віцебск);

II месца – *Зярноў Мікалай Мікалаевіч* (г. Верхнядвінск), Мадатава Дзіна Міхайлаўна (г. Лепель), Паўлаў Аляксей Андрэевіч (г. Віцебск);

III месца – *Пісарэнка Максім Генадзьевіч* (г. Віцебск), Пушкарова Карына Юр'еўна (г. Віцебск);

**намінацыя “народныя спевы”**

III – месца – *Лернатовіч Марына Сяргееўна* (г. Докшыцы);

**намінацыя “эстрадныя спевы (ансамбль)”**

II месца – Трыо народнай студыі эстраднага майстэрства “Тандэм” Полацкага РДК;

**намінацыя “размоўны жанр”**

I месца – *Старцаў Яўген Віктаравіч* (г. Полацк), *Кучарава Сняжана Фёдараўна* (г. Полацк);

**намінацыя “сучасны танец”**

II месца – народны студэнцкі харэаграфічны ансамбль “Віцябчанка” УА “Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”, харэаграфічная студыя “Вікторыя” філіяла БДТУ “Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж”;

**намінацыя “дызайн”**

II месца – *Пальчастая Марына Мікалаеўна* (УА “Полацкі дзяржаўны універсітэт”);



да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў: тэматычны вечар “Афганистан прошёл дорогами войны” (*сельская бібліятэка аграгарадка Асінторф)*, гадзіны мужнасці: “Время героев” (*Дзяцельская сельская бібліятэка-клуб*),“Огнём Афгана опалённые” (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіслава*ва);

да Дня юнага героя-антыфашыста: Літаратурна-музычная кампазіцыя “Кто-то родом из детства, а я из войны” (*сельская бібліятэка аграгарадка Дабрынь*), урок мужнасці “А музы не молчат” (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіслава*ва*)*, вечар памяці “Наплакались за всю войну” (*сельская бібліятэка аграгарадка Верамееўшчына*).

Убібліятэках Дубровенскага раёна ў **сакавіку** прайшлі наступныя мерапрыемствы:

свята “Любі сваю ніву, свой край”, прысвечанае 55-годдзю з дня ўтварэння саўгаса “Арловічы” (*сельская бібліятэка аграгарадка Арловічы*);

да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: вечар пытанняў і адказаў “Государство, в котором я живу” (*сельская бібліятэка аграгарадка Калінаўка*), інтэлектуальна-пазнавальная гульня “Моя Беларусь” (*сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы*), урок грамадзянства “Я – гражданин своей страны” (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіслава*ва) і інш.;

вечар-сустрэча з пісьменнікам-земляком *Э. Ялугіным (цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з ДШМ).*

### *Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк*

У галерэі “Арт-Лепель” у **сакавіку** адкрылася выстаўка работ навучэнцаў дзіцячай школы мастацтваў “Солнечная акварель детства” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**6 сакавіка** Літаратурна-музычная кампазіцыя да Дня жанчын “И глаза, как небо” (*дзіцячая бібліятэка*).

**12 сакавіка** Віртуальнае падарожжа “Прогулки по планете:

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**6 лютага** Літаратурна-паэтычная вечарына “Есть у поэта свой облог …”, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння А. Куляшова (*Бычыхінская сельская бібліятэка*).

**21 лютага** Літаратурная вечарына “Багата, родная ты мова…” (*Вархоўская сельская бібліятэка*).

**22 лютага** Святочная сустрэча з калектывам ДЛАУ “Гарадоцкі лясгас” “Сильным и смелым посвящается”, прымеркаваная да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (*Халамерская сельская бібліятэка*).

**14 сакавіка** Вечар-партрэт “Сонца і кветак, вам, дарагія жанчыны” (*Пальмінская сельская бібліятэка*).

**27 сакавіка** Свята дзесяцігадовага юбілею клуба *цэнтральнай раённай бібілтятэкі* “Залаты ўзрост” у ДУСЗ “Максімаўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў”.

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

У бібліятэках Дубровенскага раёна ў **лютым** прайшлі наступныя мерапрыемствы:

да Міжнароднага дня роднай мовы: літаратурна-музычная кампазіцыя для чытачоў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту “Родная мова – крыніца нацыянальнай самасвядомасці” (*сельская бібліятэка аграгарадка Расасна*), літаратурная гульня “Мова нашых продкаў згаснуць не павінна” (*сельская бібілтэка аграгарадка Рэдзькі*), урок роднай мовы “Далучыся да роднага слова” (*сельская бібліятэка аграгарадка Калінаўка*) і інш.;

да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь: конкурсна-гульнёвая праграма “Будем в армии служить” (*сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы*), свята “Нашай арміі героі” (*сельская бібліятэка аграгарадка Чырына)*;



III месца – *Кунцэвіч Марыя Віктараўна* (УА “Полацкі дзяржаўны універсітэт”);

**намінацыя “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”**

I месца – *Карасёва Карына Мікалаеўна* (Сенненскі раён);

II месца – *Лаўрыновіч Ганна Вадзімаўна* (Міёрскі раён), Ісмаілава Сабіна Зaураўна (Лёзненскі раён);

III месца – *Красінская Дар'я Аляксандраўна* (Шумілінскі раён), *Будзіч Іван Аляксандравіч* (Докшыцкі раён), *Мартысевіч Ксенія Віктараўна* (Лёзненскі раён);

**намінацыя “жывапіс і графіка”**

II месца – *Васілевіч Дзіяна Анатольеўна* (Шаркаўшчынскі раён);

III месца – *Казлоўская Кацярына Васільеўна* (Докшыцкі раён), Арлюкевіч Ілля Іванавіч (Шаркаўшчынскі раён), *Фёдарава Ангеліна Уладзіміраўна* (УА “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”);

**намінацыя “Фатаграфія”**

III месца – *Кайгародцава Аляксандра Алегаўна* (Гарадоцкі раён).

*Віцебскі АМЦНТ*

**Абласное свята-конкурс “Тэатральная вясна-2014”**, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (Лёзненская зона) адбылося **28–29 сакавіка** ў г. п. Лёзна. Гран-пры конкурсу атрымаў народны тэатр КСЦ УП “Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі” (рэжысёр-пастаноўшчык *Ігар Баярынцаў*). Пераможцамі ў розных намінацыях сталі:

**намінацыя “драматычны спектакль”**:

– дыплом I ступені – народны тэатр Гарадоцкага ГДК (рэжысёр *Аляксандр Безгін*);

– дыплом II ступені – узорны тэатральны калектыў “Паўлінка” ДУА “Гімназія № 2 г. Наваполацка” (рэжысёр *Святлана Свярдлова*, мастацкі кіраўнік *Святлана Паўлёнак*), узорны тэатр “Вясёлка”ДУК “Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна” (рэжысёр-пастаноўшчык Людміла Сасніцкі);

– дыплом III ступені – народны тэатр Талачынскага ГДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Святлана Васільева*);

– народны тэатр ДУК "Шумілінскі РЦК" (рэжысёр-пастаноўшчык *Таццяна Багданава*);

**намінацыя "малыя тэатральныя формы":**

– дыплом I ступені – народны тэатральны калектыў "Катарсіс" ДУК "Гарадскі палац культуры г. Оршы" (рэжысёр-пастаноўшчык *Тамара Цвіркі*).

Дыпломы па дадатковых намінацыях:

**"за сцэнічнае ўвасабленне твораў сучасных беларускіх аўтараў"** – народны тэатральны калектыў ДУК "Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна" (рэжысёр-пастаноўшчык *Наталля Андрыянава*), народны драматычны калектыў "Тэатр" Віцебскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Юрый Іваноўскі*), народны тэатр Багушэўскага ГпДК Сенненскага раёна (рэжысёр-пастаноўшчык *Юрый Іваноўскі*);

**"за лепшую сцэнаграфію"** – народны тэатр Гарадоцкага ГДК (рэжысёр *Аляксандр Безгін*);

**"за лепшае музычнае афармленне"** – народны аматарскі тэатральны калектыў "У пошуку" Лёзненскага РЦК (рэжысёр-пастаноўшчык *Генадзь Цыганкоў*);

**"за лепшы спектакль для дзяцей"** – узорны тэатральны калектыў "Паўлінка" ДУА "Гімназія № 2 г. Наваполацка" (рэжысёр *Святлана Свярдлова*, мастацкі кіраўнік *Святлана Паўлёнак*);

**"за лепшы спектакль для моладзі"** – узорны тэатр "Вясёлка" ДУК "Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна" (рэжысёр-пастаноўшчык *Людміла Сасніцкі*);

**"за сінтэз розных жанраў мастацтва"** – народны тэатр Талачынскага ГДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Святлана Васільева*);

**"за лепшую мужчынскую ролю"** *Аляксандр Ніканенка* (народны тэатр Гарадоцкага ГДК);

**"за лепшую жаночую ролю"** – *Вераніка Саладухіна* (народны



прысвечаная ўдзельнікам вайны ў Афганістане (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**14 лютага** Краязнаўчая гадзіна "Валынецкае гета" (*Антонаўская сельская бібліятэка*).

**28 лютага** Літаратурна-музычная кампазіцыя "Подзвігу салдата пакланіся" (*Шайцераўская сельская бібліятэка*

**6 сакавіка** Сустрэча з паэтам *Л. Дранько-Майсюком* і бардам *Э. Акулiным* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**14 сакавіка** Дзень праваслаўнай кнігі "Живое слово мудрости духовной" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 сакавіка** У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі адбылося свята "Королевство Многочитай" (*дзіцячая бібліятэка*).

### *Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка*

**6 лютага** Літаратурна-паэтычная вечарына "Ёсць у паэта свой аблог цалінны…"**,** прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова (*Курынская сельская бібліятэка*).

**7 лютага** Гульня-прэзентацыя "Хутчэй, вышэй, мацней, або Што я ведаю пра Алімпійскія гульні?" (*Альгоўская сельская бібліятэка*).

**9 лютага** Фальклорная вечарына "Калі не помніць прашчураў сваіх, у будучыню трапіць немагчыма" (*Скрыдлёўская сельская бібліятэка-клуб*).

**15 лютага** Дзень памяці "Афганістан – наша памяць і боль". У рамках мерапрыемства: вусны часопіс з відэахронікай, кніжна-ілюстрацыйная выстаўка "Афганістан: святая памяць" і інш. (*Даўжанская сельская бібліятэка*).

**20 лютага** Адкрыццё выстаўкі работ мастака А. Пшонкі "Горад, дзе жывуць ілюзіі" (*Кіраўская сельская бібліятэка*).

**23 лютага** Вандроўка па старонках кніг А. Міцяева і С. Аляксеева "Русский солдат умом и силою богат" для чытачоў малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту (*Альгоўская сельская бібліятэка*).

супрацоўнікамі аддзела дзіцячай літаратуры ў рамках праекта “Стиль жизни: встречи с интересными людьми”.

**24 сакавіка** ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры адбылася чарговая сустрэча членаў народнага клуба кветкаводаў-аматараў “Флора”.

***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**19 сакавіка** Адкрылася выстаўка-дыялог работ майстроў народнага клуба ласкутнага шыцця “Рошва” (г. Полацк) “Красное и черное: игра воображения”.

**24 сакавіка** Гучныя чытанні ў дзіцячай паліклініцы “Читай, я буду слушать” (*дзіцячая бібліятэка імя А.С. Пушкіна*).

З **24** па **30 сакавіка** ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі адбыліся літаратурныя конкурсы, віктарыны, інтэлект-шоу “Суперчитатель”, гадзіна галаваломак “Любимые сказки в клетку и в строку” і інш.

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**7 лютага** Літаратурна-паэтычная вечарына “Мой маналог, як палымяны конь”, прысвечаная творчасці А. Куляшова (*Далёкаўская сельская бібліятэка*).

**20 лютага** Круглы стол “Бібліятэкі Браслаўшчыны: традыцыі, інавацыі, творчы пошук”.

Да 70-годдзя вызвалення Беларусі прайшлі наступныя мерапрыемствы: патрыятычны ўрок “У агні партызанскай вайны” (*дзіцячая бібліятэка*), гістарычная гадзіна “Маленькія героі вялікай вайны” (*Мяжанская сельская бібліятэка*) і інш.

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**10 лютага** Прэзентацыя кнігі “Испытание мужеством”,



тэатр ДУК “Шумілінскі РЦК”), *Карына Сасноўская* (узорны тэатр “Вясёлка” ДУК “Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна”);

**“за лепшую мужчынскую ролю другога плана”** – Іван Гусакоў ( народны тэатр ДУК “Шумілінскі РЦК”);

**“за лепшую жаночую ролю другога плана”** – *Ганна Селех* і *Анастасія Спасібёнак* (узорны тэатральны калектыў “Паўлінка” ДУА “Гімназія № 2 г. Наваполацка”);

**“за лепшую эпізадычную ролю”** – *Яраслаў Еўтушан* (народны тэатральны калектыў ДУК “Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна”);

**“прыз глядацкіх сімпатый”** – народны аматарскі тэатральны калектыў “У пошуку” Лёзненскага РЦК (рэжысёр-пастаноўшчык *Генадзь Цыганкоў*).

**Выстаўка тэатральнага касцюма “Вобраз? Сучаснасць... Тэатр!”**:

– дыплом “За ўдзел” – народны драматычны калектыў “Тэатр” Віцебскага РДК (рэжысёр-пастаноўшчык *Юрый Іваноўскі*), народны аматарскі тэатральны калектыў “У пошуку” Лёзненскага РЦК (рэжысёр-пастаноўшчык *Генадзь Цыганкоў*).

**Выстаўка-конкурс “Юбілейная паштоўка”, прысвечаная 75-годдзю з дня ўтварэння ДУ “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”:**

– дыплом “За ўдзел” – народны тэатральны калектыў і ўзорны тэатр “Вясёлка” ДУК “Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна”, народны тэатральны калектыў “Катарсіс” ДУК “Гарадскі палац культуры г. Оршы”, народны тэатр Талачынскага ГДК;

– дыплом “За ўдзел у дабрачыннай акцыі «Пасылка фронту»”: узорны тэатральны калектыў “Паўлінка” ДУА “Гімназія № 2 г. Наваполацка”, народны тэатр Талачынскага ГДК, народны тэатральны калектыў “Катарсіс” ДУК “Гарадскі палац культуры г. Орша”, узорны тэатр “Вясёлка” ДУК “Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна”,

народны тэатр Багушэўскага ГпДК Сенненскага раёна.

*Віцебскі АМЦНТ*

**29 сакавіка** ў Палацы творчасці дзяцей і моладзі г. Віцебска адбыўся **IV раённы фестываль маладых выканаўцаў эстраднай песні "Две сестры – Беларусь и Россия"**, прысвечаны Дню яднання народаў дзвюх брацкіх краін. Гран-пры конкурсу атрымала ўзорная эстрадная студыя "Трельки" (СШ № 6 г. Полацка), уладальнікамі дыпломаў I катэгорыі сталі 10 намінантаў, II і III – 14, 5 удзельнікаў атрымалі прызы ў розных намінацыях. Спецыяльны прыз Цэнтра нацыянальных культур ДУ "Цэнтр культуры «Віцебск»" ўручылі муніцыпальнай бюджэтнай адукацыйнай установе "Дом детского творчества Рудни Смоленской области".

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 1 апр. – С. 2.*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

З **10** па **14 лютага** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы для загадчыкаў і бібліятэкараў гарадскіх, гарпасялковых і цэнтральных бібліятэк.

*Віцебскі АМЦНТ*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**5 лютага** ў філіяле № 3 ДУАЗ "ВГЦП" палікклініцы № 4 імя У.І. Леніна прайшло мерапрыемства, прысвечанае пытанням здаровага ладу жыцця насельніцтва. У рамках мерапрыемства супрацоўнікі аддзела перыядычнай літаратуры і аддзела "Агульная чытальная зала" падрыхтавалі выстаўку і правялі бібліяграфічны агляд літаратуры па тэме здаровага ладу жыцця.

**7 лютага** супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры правялі літаратурна-музычную кампазіцыю "Памяць Афгана – боль Афгана", прысвечаную 25-годдзю вываду савецкіх войск з Афганістана. Мерапрыемства прайшло ў ДУА "Гімназія № 5".



**11 лютага** супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры арганізавалі і правялі літаратурнае свята для школьнікаў ДУА "Сярэдняя школа № 46" "Лесные загадки В. Бианки", прымеркаванае да 120-годдзя з дня нараджэння дзіцячага пісьменніка В. Біянкі. Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з творчасцю пісьменніка, правялі конкурсы, гульні і віктарыны.

**20 лютага** прайшла прэзентацыя электроннага рэсурсу "Афганистан. Без права на забвение", створанага да 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана і прысвечанага воінам-інтэрнацыяналістам Віцебшчыны.

**26 лютага** ў бібліятэцы адбылося адкрыццё выстаўкі графікі члена Саюза дызайнераў Рэспублікі Беларусь *Алены Віктараўны Гурынай* "З кнігі сноў...".

**1 сакавіка** супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры сумесна з валанцёрамі УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» і валанцёрамі Праваслаўнага маладзёжнага брацтва ў імя святога праведнага Іаана Кранштацкага прынялі ўдзел у свяце праводзін зімы ў ДУА "Детский дом г. Витебска".

**7 сакавіка** супрацоўнікі аддзела "Электронная чытальная зала" правялі тэматычны Дзень інфармацыі "Выбор профессии – выбор будущего" для навучэнцаў ДУА "Гімназія № 5 г. Віцебска".

**20 сакавіка** ў аддзеле літаратуры па мастацтве ў рамках салона Олі-art адбыўся творчы вечар заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь (1991), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (2005), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2003), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2009), прафесара Беларускай акадэміі мастацтваў, акадэміка Міжнароднай Кірыла-Мяфодзьеўскай акадэміі славянскай асветы, дырэктара–мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа *Валерыя Данілавіча Анісенкі* "Встреча с земляками".

**18 сакавіка** ў ДУА "Дзіцячы дом г. Віцебска" адбылася сустрэча выхаванцаў з акцёрамі Беларускага тэатра "Лялька", арганізаваная